ства автомобильного транспорта не было, и поэтому автотранспортники расширяли покупку путёвок за счёт фондов предприятий [9, л. 53].

В целом в первое послевоенное время расширению мероприятий по организации отдыха работников содействовало образование в 1947 г. фонда директора предприятия, заменившего его фонда предприятия для улучшения культурно-бытовых условий работников и совершенствования производства в 1955 г., укрепление отмеченного фонда в 1963 г.

**Заключение.** Обеспечение работникам отдыха в законодательном порядке являлось проявлением внимания органов власти и парторганов к вопросам охраны труда, так как отдых способствовал восстановлению работоспособности, создавал благоприятные условия для роста производительности труда и повышения культурно-образовательного уровня занятых на транспорте.


1. Трошин, А. Развитие советского трудового законодательства / А. Трошин // Охрана труда и социальное страхование. – 1978. – № 1. – С. 4–5.
2. Государственный архив Могилевской области. – Ф. 444. Оп. 2. Д. 17.
3. Национальный архив Республики Беларусь (НАРБ). – Ф. 873. Оп. 2. Д. 1б.
4. Аграновская, А. Шире привлекать к профсоюзной работе / А. Аграновская // Речник Белоруссии. – 1948. – 25 декабря. – С. 2.
5. НАРБ. – Ф. 1005. Оп. 1. Д. 1.
6. Усиков, А. Постоянно совершенствовать работу советов социального страхования / А. Усиков // Советские профсоюзы. – 1953. – № 1. – С. 46–51.
7. Постановление Совета Министров СССР «Об изменении порядка планирования капитальных вложений на жилищное, коммунальное, культурно–бытовое строительство и на развитие строительной индустрии», 30 мая 1958 г. // Собрание постановлений правительства СССР. – 1958. – № 9. – С. 216–218.
8. Кацяш, Г. І. Стальныя магістралі рэспублікі / Г. І. Кацяш – Минск : Дзяржвыдавецтва БССР, 1957. – 50 с.
9. Государственный архив Гомельской области. – Ф. 165. Оп. 1. Д. 2.


## ВЫДАВЕЦКАЯ АГІТАЦЫЙНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ БСГ ПАДЧАС РЭВАЛЮЦЫІ 1905–1907 ГГ.


*А.Д. Тогулева*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*


Беларуская сацыялістычная грамада – першая беларуская нацыянальная палітычная партыя, якая ўзнікла напачатку XX стагоддзя і адстойвала нацыянальныя і сацыяльныя інтарэсы беларускага этнасу. На прабуджэнне нацыянальнай і палітычнай свядомасці беларускага народа была накіравана выдавецкая агітацыйная дзейнасць пратыі ў перыяд першай расійскай рэвалюцыі 1905–1907 гг. Мэтай даследавання з’яўляецца аналіз выдадзеных БСГ пракламацый і асноўных патраванняў, выказаных у іх.

**Матэрыял і метады.** У якасці матэрыяла былі выкарыстаны дакументы з фондаў НАРБ, артыкулы дзеячоў беларускага нацыянальна-вызваленчага руху М. Мялешкі, А. Бурбіса, гісторыка А. Сідарэвіча. Рэалізаваны лагічныя метады даследавання, а таксама метады гістарычна-параўнальнага і сістэмна-комплекснага аналізу навуковай літаратуры і крыніц.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Першая расійская рэвалюцыя пачалася 9 студзеня 1905 г., калі загадзя падрыхтаваныя войскі па загаду цара ў розных месцах Пяцярбурга расстралялі масавыя шэсці рабочых, якія накіроўваліся да Зімняга палаца з просьбай палепшыць становішча народа. Гэтай акцыяй царскі ўрад спадзяваўся прадухіліць рэвалюцыю. Аднак атрымалася непрадбачанае: залпамі на Дварцовай плошчы і ў іншых месцах сталіцы была расстраляна не рэвалюцыя, а вера народа ў цара. У выніку абудзілася каласальная рэвалюцыйная энергія. Магутныя, непрадбачаныя раней хвалі выступленняў пратэсту – стачак, вулічных дэманстрацый і маніфестацый рабочых пракаціліся па ўсёй краіне, у тым ліку і па Беларусі.

Адгукнулася на гэтыя падзеі і Беларуская Сацыялістычная Грамада. У сваёй пракламацыі “Царава жніво” яна пісала наступнае “...Дзевятага дня студзеня месяца пайшлі пад цараў палац, і як папрыбіраліся, як на свята, бацюшку Гапона наперад пусцілі, шапкі паздымаўшы пад палац падыходзяць. Цар добра ведаў, чаго работнікі да яго ідуць, а такі выпусціў на народ войска, жандараў, казакаў народ разганяць. Сталі страляць, конямі таптаць, шаблямі сеч і забілі і накалечылі больш як дзве тысячы народу.

Тут толькі пазналі работнікі, што ад цара нічога добрага не спадзявацца, што цар - быцька толькі для крыўдзіцеляў нашых, для паліцыі, фабрыкантаў, паноў, а для нас, - беднаты працавітай, ён найбольшы крыўдзіцель...” [1, с. 39]. Грамада заклікала скінуць далоў цара і яго ўрад.



Репозиторий ВГУ

У сакавіку 1905 г. Грамада разам з партыяй эсэраў склікае ў Мінску першы сялянскі з'езд, пасля якога была выдадзена пракламацыя "Першы мужыцкі з'езд". У гэтай пракламацыі БСГ закладае агульныя рысы сваёй будучай аграрнай праграмы, яна кажа: "Усякі ведае, што мужыку цяжка жыць на свеце. З мужыкоў цар дзярэ падаткаў больш як за ўсіх: паны плацяць 236 млн. рублей у год, а мужыкі 700 млн., значыць у тры разы больш, а зямлі ў цара і паноў у два разы болей, як у мужыкоў, і цар, і паны, і чыноўнікі – усе жывуць з цяжкай мужыцкай працы...» [2, арк.4–5]. Далей гаворыцца аб тым, што гледзячы на ўсё гэта, ў Мінск з'ехаліся прадстаўнікі ад сялян, каб вырашыць, што ім рабіць. Яны надумаліся, што "каб кожны, хто хоча на зямлі працаваць, мог дастаць столькі зямлі, колькі яму трэба, каб з яе сваёй працай пражыць; трэба значыць , каб уся зямля належыла да тых, хто на ей працуюць. Дзеля гэтага трэба ўсю зямлю адабраць ад цара, казны ды паноў..." [2, арк. 4–5]. І тут селяніну даюцца развагі, як жа гэту зямлю дастаць ад паноў? Купіць можа толькі багаты, а бядняк так голым і застанецца, ды ўсёй зямлі ніхто і не прадасць. Прасіць паноў і цара, каб надзялілі мужыкоў, няма рацыі, бо цары ў сваіх маніфестах кажуць, што ніякіх новых надзелаў зямлёй не будзе. А калі пайсці прасіць да цара, то ён пастраляе так, як пастраляў рабочых. "Калі ні купіць зямлі нельга, калі ні цар, ні паны самі яе мужыкам не дадуць, то трэба, значыцца, дастаць зямлю сілай. Вядома, што цар мае войска і пасылае тое войска біць і страляць мужыкоў, калі яны дзе захочуць справядліва падзяліць зямлю... А каб-жа мы ўсе, колькі нас ёсць, зрабілі адну грамаду, каб усе сто мільёнаў зрабілі адну грамаду, каб усе сто мільёнаў, ці болей мужыкоў падняліся як адзін чалавек, што тады мог бы зрабіць нам цар, яго войска ды паны?... Каб гэтага дабіцца, трэба нам усім згаварыцца, трэба, каб кожны мужык ведаў, што адзін мужык,- гэта толькі мужык, а ўсе мужыкі разам – гэта сіла. Як мы будзем мець тую сілу, то зробім усё, што захочам" [2, арк. 5].

Дзеля гэтага на сялянскім з'ездзе вырашылі, што трэба: "... каб мужыкі на вёсках рабілі грамады-брацтвы, дзе-б усе маглі згаварыцца, што ім рабіць, тыя брацтвы павінны злучацца адно з другім праз сваіх выбарчых, каб зрабіць адну вялікую мужыцкую грамаду" [2, арк. 5]. Такая была дадзена схема для арганізацыі сялянства. Мажліва, што такая схема арганізацыі разлічвала на вясковую беднату, якая перш за ўсіх павінна была выступіць, як актыўная сіла ў вясовых грамадах. Далей раілася сялянам збіраць грошы, на якія купляць і чытаць кніжкі, уцягваць у грамаду найболей людзей, і каб найболей ведалі, чаго селяніну патрэбна. Раілася ўлетку няйсці ў двор да пана на працу, калі пан ня згодзіцца прызнаць, што зямля родзіць пры сялянскай працы на ёй, і не захоча "па справядлівасці" падзяліцца ўраджаем. "Калі на гэта згоды ня будзе, то каб панскае і казёнае ня глумілася, збярэмся ўсім сялом, скосім, сажнём, падзелім на ўсіх і звязём да сваёй хаты, а не казна ды пана. Пасля забярэм усю зямлю, каб усе тыя, што на зямлі сваімі рукамі працуюць, маглі роўна з яе карыстаць" [2, арк. 6].

БСГ ясна разумела, што добраахвотна зямлю ніхто не ўступіць і што без грамадзянскай вайны не абысціся. Таму неабходна запасацца зброяй, каб абараняцца, але і каб заваяваць новы парадак карыстання зямлёй. "... Але павінны мы ведаць, - гаварылася ў пракламацыі,- што цар пашле на нас паліцыю, жандараў, казакаў ды салдат, каб бараніць сваю і панскую зямлю, ды біць і страляць нас. Тады выйдзе вялікая сварка, выйдзе вайна, і трэба нам да гэтага прыгатавацца. Трэба дастаць стрэльбы, рэвальверы і вінтоўкі, каб было чым абараніцца і заваяваць новы парадак карыстання зямлёй кожнаму, хто на ёй сам працуе [2, арк. 6]. Такія рэвалюцыйныя лозунгі былі характэрны для БСГ у пачатковы перыяд рэвалюцыі.

Цяпер трэба разглядзець, які парадак землекарыстання ў 1905 г. Грамада мела на ўвазе ўстанавіць, калі зямля будзе заваявана сялянамі. Перш чым прапанаваць сялянам свой праект, БСГ робіць невялікі ўступ, так разважаючы: "Можна было б даць кожнаму па кавалку, няхай сабе, па сотцы на сям'ю, але што з таго? Ужо сыны нашы не мелі б пароўну, бо адзін чалавек падзяліў бы сваю частку на двух, а другі на пяцярых сыноў, ці болей, і зноў пайшло б тое самае, што і цяпер. Трэба значыць зрабіць іначай" [2, арк. 4]. І тут Грамада прапануе два праекты.

Па першаму прапаноўваецца калектыўнае карыстанне зямлёй. "Добра было б каб, уся вёска, ці часць яе, калі яна надта вялікая, не дзяліла зямлі, але каб вяла гаспадарку гуртам. Выбрала б яна сабе чалавек пяць такіх, што ўмеюць чытаць ды пісаць і шчоты ўмеюць весці, і тыя выбраныя каб запісвалі, колькі дзён кожны мужык на зямлі працаваў. Восенню кожны возьме сабе столькі хлеба, каб пракарміцца, а рэшту прададуць гуртам і дадуць кожнаму столькі грошай, колькі яму на рабоце выходзіць" [2, арк. 4]. Але праект гэты вельмі няспелы. БСГ, улічваючы настрой сялянства, як дробнаўласніцкія імкненні, відаць, баялася гэты свой праэкт развіваць і дэталізаваць, каб не адхіліць сялянскую масу ад рэвалюцыйнай барацьбы за зямлю.

Калі такі калектыўны спосаб карыстання зямлёй каму не спадабаецца, то Грамада прапанавала другі праект, па якому "кожная сям'я дастае столькі зямлі, колькі на яе выпадае.



Рэпазіторый ВДУ

На гэтай зямлі працуюць 12 год ці меней, а потым выбарныя з усей вёскі глядзяць, калі ў яго дзяцей прыбыло, то яму зямлі прыбаўляюць, калі дзяцей паменьшыла аднімаюць. Пры гэтым спосабе кожны вядзе гаспадарку асобна" [2, арк. 4].

У галіне палітычнага ўпарадкавання БСГ патрабавала тэрытарыяльнай незалежнасці або аўтаноміі Беларусі з сеймам у Вільні. "Кожны народ павінен мець свой сейм, які вёў бы яго справы..." [2, арк. 4].

Тым часам барацьба працоўнага люду ўздымалася ўсё больш. Трэба было выкарыстаць усе магчымыя сродкі барацьбы за зямлю. Летам 1905 г. БСГ рыхтуе ўсеагульную забастоўку парабкаў і беднага сялянства Беларусі, якая павінна даць парабкам і падзёншчыкам больш зарабатак, а сялянам значныя палегкі, залежныя ад двору. З гэтай мэтай Грамада у чэрвені месяцы выдае пракламацыю "Да ўсіх работнікаў і работніц дваровых, да ўсіх дзеравенскіх людзей на туташняй зямлі Беларускай", ў ліку 10000 экзэмпляраў [3, с. 157]. Звычайна ў агітацыйнай літаратуры 1905 г. гаварыцца аб сялянстве, як аб адным цэлым і рэдка сялянства падзялялася на батракоў, вясковае сялянства і кулакоў. БСГ падзяляе сялянства на некалькі груп, якія маюць свае ўласныя эканамічныя патрэбы, і падыходзіць да кожнай групы асобна. Тут мы бачым гадавых дворных парабкаў, падзённых работнікаў, дворную чэлядзь і наогул сялянства – "усе дзеравенскія людзі". Спачатку даводзіцца, што мужыкі абліваюць зямлю сваім потам, і што іх крывавай працай жывуць паны, чыноўнікі і іншыя дармаеды. Што зямля нічыя, і павінны карыстацца зямлёй тыя, хто на ёй працуе. Што каб адабраць ад паноў і казны зямлю, трэба быць арганізаванымі ў адну грамаду, а пакуль такой грамады няма, адабраць зямлю немагчыма, дзеля гэтага трэба дабівацца большай карысці ад сваёй працы. Таму трэба і працоўнай вясковай беднаце, таксама як гэта робяць работнікі на фабрыках і заводах, дабівацца ад паноў большай платы за сваю працу - забастоўкай. Дзеля гэтага трэба ўсім разам згаварыцца і не пайсці на панскую працу, пакуль пан не задаволіць выстаўленых патрабаванняў. У паасобку падзённым работнікам і работніцам раілася: "Сёлета ад Пятра і Паўла згаварыцеся і ня ідзіце на работу, калі памешчыкі ня будуць плаціць за работу на палавіну болей, як цяпер, а дзе зусім мала плацяць – у два разы болей. Калі дастанеце гэты лісток пасля Пятра і Паўла, то пачніце зараз забастоўку [3, с. 157].

Далей ідуць запатрабаванні людскага абыходжання: 4 гадзіны на адпачынак, 1 гадзіна на снеданне, 3 гадзіны на палудзень і прыбаўка платы за працу пасля заходу сонца.

Усім гадавым работнікам і работніцам і ўсёй дваровай чэлядзі раілася гэтак сама запатрабаваць на палавіну павысіць плату, а малую ў два разы, прасторных хат і асобных для сямейных, даваць даволі ардынарыі і ежы: разы 2–3 у тыдзень мяса і ад вясны да восені "на падвячорак, хоць па квартцы несабіранага салодкага малака кожны дзень".

Усім "дзеравенскім людзям" прапаноўвалася паменшыць арэнду на палавіну, не плаціць пану за пусткі, якія знаходзіліся ў вёсцы, збіраць у лесе грыбы, ягады, мох, хворост, "нікога не пытаючыся", разбураць у панскіх млынах застаўку, калі яна затапляе вясковыя сенажаці і не дазваляць адбудоўваць іх нанава і інш. "Цвёрда трымайцеся, - гаворыцца ў канцы пракламацыі, - згаварыцеся разам усе і не ўступайце, не ідзіце на работу, пакуль усяго гэтага, што вы патрабуеце, вам ня зробяць. Калі ёсць у вас яшчэ якія патрэбы, апрача гэткіх, то і аб іх заявіце памешчыкам..." [3, с. 158].

Згодна з гэтай пракламацыяй дзейнічалі парабкі фальварка Лошыца недалёка ад Мінска, якія зрабілі забастоўку і прапанавалі памешчыку устанавіць 14-гадзінны працоўны дзень, змяніць эканома, павялічыць ардынарыю і інш. [4, с. 264]. Безумоўна, гэтыя патрабаванні мелі вельмі абмежаваны характар, але тым не менш яны ўносілі элемент арганізацыі ў выступленні сельскагаспадарчых рабочых. Дзякуючы працы беларускіх рэвалюцыянераў, сацыялістычныя ідэі з лозунгамі вызвалення ад самадзяржаўя і эканамічнага ўціску ўпершыню трапляюць у шматлікія глухія закуткі Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губерняў.

Такім чынам, дзеля перамогі рэвалюцыі над царызмам БСГ лічыла неабходным: саюз сялянства з рабочымі, арганізацыю сялянства ў грамады праз пярвічныя вясковыя ячэйкі, захоп зямлі сілай, што можа здарыцца пры грамадзянскай вайне, дзеля чаго неабходна арганізаваны народ узброіць, змагацца з паліцыяй, не спыняцца нават перад забойствам паліцэйскіх [3, с. 154].

У пракламацыі "Што такое канстытуцыя" БСГ выстаўляла наступныя палітычныя патрабаванні: скліканне канстытуцыйнага сходу з прадстаўнікамі народа, выбранымі агульным, роўным і тайным галасаваннем; свабоды слова, друку, змовы , брацтваў, сходаў; свабоды веры і народнасці; адказнасці чыноўнікаў перад судом; выбарнасць суда і суддзяў і інш. [1, с. 39].

Пасля абвяшчэння царскім урадам Маніфеста 17 кастрычніка 1905 г. БСГ ў лістоўцы "Беларускі сялянскі саюз" указвае на тое, што Дзяржаўная Дума, якую паабяцаў Маніфест,



Рэпазіторый БрДУ

“нам не патрэбна”, замест Думы неабходна дабівацца Устаноўчага сходу, які і ўмацуе свабоды, абвешчаныя Маніфестам. Далей гаворыцца, што ўсе землі: казённые, удзельныя, манастырскія, касцёльныя, усе фальваркі і маёнткі, лясы і рэкі павінны перайсці ў рукі ўсяго народа, “да ўсёй нацыі” [5, с. 64–67]. Гэтаму ж была прысвечана і надрукаваная ў кастрычніку 1905 г. пракламацыя “Царова Дума”, у якой БСГ заклікала байкатаваць Думу, прапагандавала ідэю народнага сходу Літвы і Беларусі ў Вільні [3, с. 153].

Асабліва павялічылася выдавецкая справа Грамады пасля заснавання ў канцы 1905 г. уласнай друкарні ў Мінску, якую ўзначаліў Ф.Стэцкевіч, якога спачатку пасылалі ў Галіцыю вывучаць друкарскую справу [6, с.7]. У гэты ж час БСГ выдала ў перакладзе на беларускую мову Маніфест Пецярбургскага Савета рабочых дэпутатаў, Галоўнага камітэта Усерасійскага сялянскага саюза, ЦК і АК РСДРП, ЦК ПСР, ЦК ППС з заклікам да фінансавага байкоту антынароднага рэжыму [7, с. 417].

Па няпоўных звестках, нелегальныя выданні БСГ ў той час распаўсюджваліся ў гарадах Мінску. Вільні, Дзісне, Рэчыцы, Мінскім, Ігуменскім, Барысаўскім, Бабруйскім, Навагрудскім, Слуцкім паветах Мінскай губерніі, Віленскім, Лідскім, Дзісненскім, Вілейскім, Ашмянскім паветах Віленскай губерніі, Гародзенскім, Берасцейскім, Бельскім паветах Гародзенскай губерніі [7, с. 421]. Слабыя былі сувязі Грамады на ўсходзе Беларусі. Як сведчаць данясенні начальніку Магілёўскага Губернскага ўпраўлення, у Гомельскім, Рагачоўскім, Быхаўскім і Аршанскім паветах у верасні- кастрычніку 1905 г. не было знойдзена ніякіх доказаў дзейнасці БСГ [8]. На тэрыторыі Віцебскай губерніі нейкія, відаць, выпадковыя сувязі былі толькі ў Віцебскім павеце.

Цэнтрам беларускага рэвалюцыйнага і культурнага руху ў канцы 1906 г. – 1907 г. стала Вільня. Сюды пераехалі браты А.І. Луцкевічы і менавіта тут разгарнулася выдавецкая дзейнасць БСГ. Вялікай колькасцю выходзілі беларускія лісткі і брашуры, зборнікі рэвалюцыйных апавяданняў і вершаў. У верасні 1906 г. у Вільні пачала выходзіць першая легальная беларуская газета “Наша доля”, прызначаная для “вясковага і местачковага рабочага люду”. Газета з’яўлялася органам БСГ, выходзіла раз у тыдзень рускімі і лацінскімі літарамі.

**Заключэнне.** Такім чынам, Беларуская сацыялістычная грамада пад час першай расійскай рэвалюцыі 1905–1907 гг. вяла актыўную выдавецкую агітацыйную дзейнасць. У пракламацыях і лістоўках, што выдавала партыя есць водгук на кожную важную падзею рэвалюцыі – Крывавую нядзелю, сялянскія з'езды, Булыгінскую Думу і г.д. У сваіх агітацыйных матэрыялах Грамада выказвала свае адносіны да пытанняў палітычнага ладу краіны, дзяржаўнага будаўніцтва Беларусі, аграрнай палітыкі, барацьбу сялян за зямлю і свае правы.

1. Сідарэвіч, А. Дакументы Беларускай Сацыялістычнай Грамады часоў рэвалюцыі 1905 г. / А. Сідарэвіч // Спадчына. – 1991. – № 3. – С. 39.
2.Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 62. Воп. 1. Спр. 204. Арк. 4–6.
3.Мялешка, М. Барацьба Беларускай Сацыялістычнай Грамады за зямлю ў 1905 г. / М. Мялешка // Полымя. – 1926. – № 1. – С.152–159.
4. Шабуня, К. И. Аграрный вопрос и крестьянское движение в Белоруссии / К. И. Шабуня. –Минск, 1962. – 264 с.
5. Ангаретис, З. Белорусская Социалистическая Громада / З. Ангаретис // Вперед. – 1923. – № 2–3. – С.64–67.
6.Стары Пиліп (А. Бурбіс) Кароткі агляд беларускага нацыянальна-рэвалюцыйнага руху / Стары Піліп (А. Бурбіс) // Вестник Народного Комиссариата просвещения БССР. – 1921. –№ 1. – С. 7.
7. Нарысы гісторыі Беларусі: у 2-х ч. – Мінск, 1994. – Ч. 1. – 527 с.
8. НАРБ. – Ф. 60. Воп. 3. Спр.6. Арк. 39–42, 93–94.

## ВЫНІКІ АРХЕАЛАГІЧНЫХ РАЗВЕДАК 2017 Г. НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСКАГА ПАНЯМОННЯ І ПАВІЛЛЯ

*С.С. Юрэцкі*
*Мінск, апарат НАН Беларусі*

На падставе дазвола на права правядзення археалагічных даследаванняў у 2017 г. археалагічныя разведкі праводзіліся аўтарам на тэрыторыі Беларускага Панямоння (Зэльвенскі раён) і Беларускага Павілля ў межах Маладзечанскага, Вілейскага і Астравецкага раёнаў. На момант правядзення палявых работ аўтар з’яўляўся навуковым супрацоўнікам аддзела захавання і выкарыстання археалагічнай спадчыны дзяржаўнай навуковай установы “Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі”.

Рэпазіторый БГУ